# ЦЁТКА
# (АЛАІЗА ПАШКЕВІЧ)

В.Ч. Хвайніцкая

# ЛІТАРАТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ




# Літаратурная дзейнасць працягвалася толькі 15 гадоў.

**Пісаць Цётка пачала ў 1902 годзе пад уплывам Ф.Багушэвіча.**

**Творчая спадчына невялікая, але разнастайная. Прадстаўлена паэзіяй, прозай і публіцыстыкай.**

**Свае творы Цётка падпісвала 28 псеўданімамі і крыптонімамі.**

**Вершы Цёткі, змешчаныя ў нелегальных выданнях «*Калядная пісанка на 1904 год*» і «*Велікодная пісанка*» («Мужыцкая доля», «Мужык не змяніўся», «Нямаш, але будзе», «Музыкант беларускі»), прасякнутыя спачуваннем цяжкай долі селяніна.**

**Вершы «Лета» і «Восень» апублікаваныя ў зборніку «*Скрыпка беларуская*» (1906). Аўтар па-майстэрску адлюстраваў асобныя моманты сялянскай працы, апісаў летнія ігрышчы і восеньскі кірмаш. У цэлым зборнік увасабляе адраджэнскую плынь у творчасці Цёткі.**




**У 1906 годзе ўбачылі свет паэтычныя зборнікі «Скрыпка беларуская»** (пад псеўданімам Гаўрыла з Полацка) **і «Хрэст на свабоду»** (пад псеўданімам Гаўрыла).

**Зборнікі выйшлі на кірыліцы і лацінкай (канец 1905 – пачатак 1906 гг.).**

**Вершы ў зборніках яскрава адлюстроўвалі тагачасныя рэвалюцыйныя настроі беларускай інтэлігенцыі.**

# ТВОРЫ




**Апавяданні:**

*Прысяга над крывавымі разорамі (1906)*
*Разумныя, да не на дурня папалі (1908)*
*Асеннія лісты (1910-1912)*

**Вершы:**

*Мужыцкая доля (1903)*
*Нямаш, але будзе (1904)*
*Музыкант беларускі (1904)*
*Наш палетак (1906)*
*З Новым Годам (1908)*
*Скора прыйдзе вясна... (1908)*
*Тры кветкі (1908)*
*Вясковым кабетам (1908)*
*Грайка (1909)*
*Гаданьне (1910)*
*Арлы-брацьці, дайце скрыдлы... (1914)*
*«Лучынка» (1914)*

**Зборнікі вершаў:**

**Скрыпка беларуская (1906):**
*Скрыпка*
*Вам, суседзі*
*Лета*
*Мае думкі*
*Вера Беларуса*
*Мужык не зьмяніўся*
*На магіле*
*На чужой старонцы*
*Восень*
*Суседзям у няволі*
*Артыст грайка*
*У дарогу*

**Хрэст на свабоду (1906):**
*Хрэст на свабоду*
*Небывалыя часы*
*Мора*
*Добрыя весьці*
*Бунтаўнік*
*Пад штандарам*
*Перад Новым Годам*
*Бура ідзе*

# ВЫХАВАННЕ І НАВУЧАННЕ

Пяру Цёткі належаць кніжкі і падручнікі для дзяцей «Гасцінец для малых дзяцей» (пераклад з украінскай мовы з малымі пераменамі), «Першае чытанне для дзетак беларусаў».

Некаторыя даследчыкі лічаць Цётку аўтарам «Беларускага лемантара, або Першай навукі чытання» (1906).

«Першае чытанне для дзетак беларусаў» - кніга ў дзвюх частках, у якіх Цётка змясціла невялікія тэксты для дзіцячага чытання на беларускай мове. Гэта былі аўтарскія вершы, апавяданні, прыпеўкі, загадкі, казкі, прыказкі.



# Агульныя асаблівасці кніг:

1. «Беларускі лемантар, або Першая навука чытання» (адрасаваны найперш настаўнікам)
2. «Першае чытанне для дзетак беларусаў» (хрэстаматыя для вучняў пачатковай школы)
3. «Гасцінец для малых дзяцей» (кніга для чытання з украінскімі тэкстамі: 7 апавяданняў, 3 загадкі з адгадкамі і 2 прымаўкі).

- агульнасць (падабенства) педагагічных прынцыпаў, на падмурку якіх грунтуецца змест і структура хрэстаматый;
- падабенства друкарскага выканання (лацінка і кірыліца);
- тэксты - апрацаваныя народныя апавяданні, песні, казкі, прымаўкі павучальнага, юмарыстычнага, этнагарфічнага, сацыяльнага прыродаапісальнага і інш. зместу;
- матывы тэкстаў асветніцкія, патрыятычныя.

# Публіцыстыка

## Артыкулы:

- **«Да вясковай моладзі беларускай»**
- **«Шануйце роднае слова!»**
- **«Аб душы маладзёжы»**
- **«Наша народная беларуская песня»**
- **«Да дзяўчатак»**
- **«Пералётныя птушкі»**
- **«Да школьнай моладзі»**
- **«Папараць-кветка»**
- **«Як нам вучыцца»**

**Выступленні пісьменніцы ў перыядычным друку 1914 г. — гэта заклік да сваіх сучаснікаў і нашчадкаў берагчы родную мову, захаваць яе як вечны скарб душы.**

**«Шануйце роднае слова!»** - *палымяны гімн беларускай мове, яе багаццю і сіле* (Сцяпан Александровіч).

Выразнасць і эмацыянальнасць выказвання дасягаецца ўмелым выкарыстаннем агульнанароднай лексікі, семантычных адценняў слоў, іх эмацыянальна-ацэначнай афарбоўкі.

**Таксама Цётка пісала нарысы, даследаванні па гісторыі беларускага тэатра.**

## Нацыянальна-гістарычная місія моладзі

***На вас – моладзі – ляжыць вялікая павіннасць: развіваць далей родную мову, узбагачаць свой народ знаннем і культурай. Вы здабываеце навуку для сябе, дык дзяліцеся ёю з тымі, хто для вас цяжкай працай здабывае кусок хлеба. Толькі не кідайце роднай мовы: бо сапраўды для свайго народа тады вы ўмёрлі!***



# ЗНАЧЭННЕ ТВОРЧАСЦІ ЦЁТКІ

# Цётка

– адна з самых вядомых беларускіх паэтак мяжы XIX – XX стагоддзяў.

Яна падтрымала сфармуляваную Францішкам Багушэвічам канцэпцыю нацыянальнага адраджэння, пашырыла яго эстэтыку і разам з іншымі аўтарамі-сучаснікамі змагалася за беларускую дзяржаўную ідэю.

## Цётка

прынесла ў беларускую паэзію моцную стыхію лірызму, пачуццёвасці, якая абапіралася на вобразы і мастацкія прыёмы фальклору.

# Героі і гераіні Цёткі

траплялі ў сітуацыі на мяжы жыцця і смерці і ў такіх абставінах асэнсоўвалі сваё жыццё.

Праз некалькі дзесяцігоддзяў творы такога тыпу будуць называць экзістэнцыяльнымі.

# Цётка

**– адна з пачынальніц жанру дарожнага эсэ (падарожныя нататкі) у беларускай літаратуры XX стагоддзя .**

**Ва «Успамінах з паездкі ў Фінляндыю» пісьменніца ўзняла актуальную тэму – *Беларусь у свеце і свет для Беларусі.***

# Цётка

стварыла ўзоры:

- сацыяльна-бытавога
- алегарычнага
- псіхалагічнага
- сатырычнага апавяданняў.

Выкарыстоўвала пры гэтым прыёмы сінтэтычнага пісьма:

- рэальны сюжэт часта меў сімволіка-алегарычны план;
- містычныя перажыванні ўпляталіся ў рэалістычныя падзеі.

# Цётка

– аўтар першых беларускіх чытанак. Заклала асновы методыкі выкладання, падрыхтаваўшы «Першае чытанне для дзетак беларусаў», «Гасцінец для малых дзяцей», «Беларускі лемантар, або Першая навука чытання» (магчымы аўтар).

# Цётка

– удзельніца працэсу стварэння непадцэнзурнага, а потым і легальнага беларускага перыядычнага друку.

# Педагагічна-асветніцкая спадчына Цёткі

грунтуецца на ідэях фарміравання нацыянальна свядомай асобы, на законах хрысціянскай маралі і маральна-этычных напрацоўках усяго народа.

Вершы, празаічныя творы, творы для дзяцей, публіцыстыка ўвабралі ў сябе ўсё лепшае з педагагічна-выхаваўчай мудрасці беларускага народа.

## Як пачынальніца беларускай народнай асветніцкай справы Цётка

не толькі стварыла першы беларускі падручнік, але і заклала асновы новай беларускай асветнай методыкі.

Асабліва важнае значэнне для развіцця беларускай нацыянальна-выхаваўчай ідэі мае публіцыстыка, якая стала ўзорам асветна-педагагічных даследаванняў першай чвэрці XX ст.

# Уплыў творчасці і асобы Цёткі на беларускае нацыянальнае адраджэнне

**Пісьменніца сапраўды здзейсніла подзвіг вернасці Радзіме ў надзвычай складаных умовах, бо менавіта яна стварала і праводзіла ў жыццё нацыянальныя праекты, звязаныя з беларускай народнай асветай і ідэяй самаідэнтыфікацыі, самадастаковасці беларусаў.**

# Літаратурныя крыніцы


1. Беларуская дзіцячая літаратура : вучэб. дапам. / А. М. Макарэвіч і інш. ; пад агул. рэд. А. М. Макарэвіч, М. Б. Яфімавай. – Мінск : Выш. шк., 2008. – С. 105-132.
2. https://be.wikipedia.org/wiki/Алаіза_Пашкевіч